Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
14 СНЕЖНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 241 (27356) Кошт 1300 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Прадпрымальнік устанавіў мінімальны кошт прымусовай эвакуацыі легкавога аўтамабіля ў межах Жлобіна ў памеры Br250 тыс. Кошт эвакуацыі ў выходныя і святочныя дні, і ў начны час павялічваецца да 100%...**

СТАР. 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**Рэспубліканская акцыя «Прафілактыка і ТЫ!», якая пройдзе 14 і 15 снежня, будзе скіравана на прафілактыку п'янства. Запланавана нават правядзенне сеансаў бясплатнага кадзіравання.**

СТАР. 8

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ БЕЗУМОЎНАЙ РЭАЛІЗАЦЫІ ДЭКРЭТА ПА РАЗВІЦЦІ ДРЭВААПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

**Прэзідэнт Беларусі патрабуе безумоўнай рэалізацыі на дрэваапрацоўчых прадпрыемствах дэкрэта № 9 «Аб дадатковых мерах па развіцці дрэваапрацоўчай прамысловасці». Аб гэтым ён заявіў учора, наведваючы ААТ «Магілёўдрэў», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Бярыце ўсё ў свае рукі, у жалезныя рукавіцы і дзейнічайце», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, асноўная мэта дэкрэта ў тым, каб дырэктар на прадпрыемстве «быў начальнікам, як на Захадзе, і каб усе рабочыя і спецыялісты працавалі навыцяжку». Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым пацікавіўся, ці спыніўся адток рабочай сілы з прадпрыемства. «Майце на ўвазе, яны не маюць права звальняцца без вашага ведама, а хто пойдзе, будзе тут працаваць на прымусовых работах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да кіраўніцтва ААТ «Магілёўдрэў». Адначасова кіраўнік дзяржавы нагадаў і аб абавязацельствах дырэктараў павысіць работнікам зарплату. У першым квартале 2013 года неабходна выйсці на сярэднюю зарплату ў памеры $450-500. «Калі мы тут утрымліваем людзей і прымушаем працаваць, то павінны і цукерку даць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што рашэнні, прапісаныя ў дэкрэце, звязаны з тым, што на прадпрыемствах была правалена праграма па мадэрнізацыі, у выніку чаго нанесены ўрон. «У гэтым і наступным годзе напружвайцеся, рабіце, што не зрабілі тут за пяць гадоў», — дадаў кіраўнік дзяржавы. «Адназначна мы скарачаем праграмы па культуры, спорту — у нас усё гэта ёсць і ў Мінску, і ў абласцях. Мы перакідваем галоўныя намаганні на мадэрнізацыю прамысловасці. У сельскай гаспадарцы ў нас ужо ўсё вызначана, засталося дапрацаваць па нейкіх напрамках, а цяпер трэба пераносіць сродкі на прамысловасць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт запатрабаваў у сціслыя тэрміны завяршыць рэканструкцыю ААТ «Магілёўдрэў». На прадпрыемстве цяпер рэалізуецца інвестпраект па рэканструкцыі. Ён павінен быў быць завершаны яшчэ вясной 2009 года, аднак тэрміны неаднаразова пераносіліся, і цяпер завяршэнне ўсіх прадугледжаных праектам мерапрыемстваў плануецца ў 2013 годзе. Як далажылі Прэзідэнту, частка работ ужо завершана. У тым ліку ўстаноўлена аўтаматызаваная тэхналагічная лінія па распілоўцы драўніны, мадэрнізавана кацельня, сушыльны комплекс, устаноўлена здрабняльная машына, лінія сартавання лесаматэрыялаў. За кошт устаноўкі новага абсталявання рэзка знізіўся паказчык зносу асноўных фондаў прадпрыемства.

Аляксандр Лукашэнка агледзеў вытворчую тэрыторыю, наведаў цэхі, звярнуў асаблівую ўвагу на пытанні якасці работ, даўшы адпаведныя даручэнні. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў планы па развіцці ў ААТ «Магілёўдрэў» мэблевай вытворчасці. Дзякуючы гэтаму ствараецца замкнуты вытворчы цыкл, значна ўзрастае дабаўленая вартасць.

У тым жа ключы размова ішла і аб сыравіннай базе, дзе таксама неабходна павышаць глыбіню перапрацоўкі. «Мы жорстка разбяромся з тымі, хто прадае (за мяжу. — **Заўвага БЕЛТА**) сёння кругляком лес», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Рэалізацыя інвестпраекта ў ААТ «Магілёўдрэў» дасць магчымасць істотна нарасціць экспарт прадукцыі — прыкладна з $2 млн цяпер амаль да $24 млн у 2016 годзе. Пры гэтым удзельная вага экспарту ў агульным аб'ёме вытворчасці ўзрасце больш як да 62 працэнтаў з цяперашніх 49 працэнтаў. Выручка на аднаго работніка павялічыцца з цяперашніх $10,7 тыс. да $66 тыс.

У 2013 годзе чакаецца выхад прадпрыемства на рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі 12,5 працэнта. Цяпер гэты паказчык адмоўны і складае прыкладна мінус 26 працэнтаў. Безумоўна, гэта паўплывае і на зарплаты работнікаў — чакаецца іх істотны рост.



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка таксама наведаў старую вытворчасць ААТ «Магілёўдрэў», дзе яму далажылі аб прапанаваных мерапрыемствах па мадэрнізацыі і тэхпераўзбраенні, азнаёміўся з узорамі выпускаемай на прадпрыемстве прадукцыі.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# МАЯ ІДЭЯ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**У Брэст прыбыла перасоўная выстава «100 ідэй для Беларусі», арганізаваная пад патранажам БРСМ. На выставе прадстаўлены цікавыя распрацоўкі, якія маладыя людзі прыдумалі самі. Мазаіку з самаклейнай паперы дэманструе Дар'я Пешкур з Дома навучэнцаў і работнікаў устаноў прафесійнай адукацыі Брэсцкай вобласці.**

*ЛІЧБА ДНЯ*

***18 краін***

*працоўнай міграцыі — геаграфія выезду нашых суайчыннікаў. Прычым, адказваючы на пытанне аб сваёй рабоце за мяжой, рэспандэнты назвалі толькі 6 — Расію, Польшчу, Літву, ЗША, Нарвегію і Венесуэлу, а гаворачы аб краінах, у якіх працуюць сваякі, рэспандэнты назвалі дадаткова 12 дзяржаў (у іх ліку Украіна, Германія, Кітай, Грэцыя, Ізраіль і іншыя). Лідзіруюць у гэтым своеасаблівым рэйтынгу пераваг Расія і Польшча, якія прадстаўляюць галоўныя ўсходні і заходні вектары работы за мяжой для насельніцтва Беларусі.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 7° |
| Віцебск | – 8° |
| Гомель | – 9° |
| Гродна | – 7° |
| Магілёў | – 8° |
| Мінск | – 8° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8590,00 | ■ |
| Еўра | 11240,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 280,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1061,15 | ■ |

■ Будзь у курсе

# УРОКІ Ў ШКОЛАХ ПА СУБОТАХ МОГУЦЬ БЫЦЬ АДНОЎЛЕНЫЯ

**На думку міністра адукацыі Сяргея Маскевіча, лепшым спосабам павышэння якасці ведаў у старшакласнікаў будзе ўвядзенне на старэйшай ступені школы шостага вучэбнага дня.**

Магчымасць вяртання да вучэбнай шасцідзёнкі ў старэйшых класах абмяркоўвалася на семінары, які прайшоў у Глыбокім. Асноўнае пытанне, адказ на якое шукалі спецыялісты, тычылася пошуку найбольш эфектыўных мадэляў дыферэнцыяцыі навучання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

— Я лічу, што на трэцюю ступень школы ў 10-11-я класы павінны ісці толькі матываваныя школьнікі, а ў навучальных установ павінна быць магчымасць рэалізацыі праграм на павышаным узроўні, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі міністр.

Аналіз работы Глыбоцкага раёна па ўкараненні факультатыўных праграм падштурхоўвае да высновы, што вывучэнне прадметаў на факультатыўным узроўні наўрад ці можа разглядацца ў якасці эфектыўнага варыянта арганізацыі профільнага навучання. «Два факультатывы і два ўрокі — горшы варыянт, чым чатыры паўнацэнныя ўрокі, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч. — Я лічу, што пытанне рэалізацыі дыферэнцыяцыі падрыхтоўкі ляжыць не проста ў плоскасці павелічэння якасці факультатываў, а ў якасці правядзення менавіта ўрокаў».

Нагадаем, што напярэдадні бягучага навучальнага года міністр адукацыі выказаўся за магчымае падаўжэнне заняткаў у школах на летні час. «Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання паказваюць, што нашым вучням адназначна не хапае яшчэ адной гадзіны на тыдзень па такіх прадметах, як фізіка і матэматыка. Значыць, нам трэба дабаўляць гадзіны ў вучэбную праграму», — заявіў Сяргей Маскевіч, выступаючы на жнівеньскай нарадзе сталічных педагогаў у Палацы Рэспублікі.

Па выніках ЦТ сёлетняга года сярэдні бал абітурыентаў, якія здавалі матэматыку, склаў па краіне 33,3 , а па фізіцы — 24,9. Дарэчы, летась сярэдні бал на ЦТ па матэматыцы быў яшчэ меншы — 21,6, а па фізіцы — 18,6. Але чарговае ЦТ, несумненна, падкінула кіраўнікам сістэмы адукацыі новую порцыю інфармацыі для роздуму.

Праўда, перспектыва падаўжэння навучальнага года зусім не ўзрадавала ні бацькоў школьнікаў, якія, між іншым, пастаянна скардзяцца на праблему перагрузак, ні школьных настаўнікаў. А з боку дэпутацкага корпусу, якому пры прыняцці Кодэкса «Аб адукацыі» ўдалося адстаяць ранейшую працягласць летніх канікул, прагучала прапанова больш шчыльна прыгледзецца да вольнай ад урокаў школьнай суботы.

У свой час пры пераходзе на пяцідзёнку ставілася некалькі мэтаў: каб дзеці больш часу праводзілі з бацькамі, актыўна займаліся спортам і каб у школьнікаў палепшылася здароўе. Але ні першай, ні другой мэты дасягнута не было. І сёння з 11-х класаў выходзіць толькі 8% цалкам здаровых дзяцей. Словам, ні здароўя не дабавілася ў школьнікаў, ні ведаў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Соцыум

# НА НОВАЕ МЕСЦА ЖЫХАРСТВА І РАБОТЫ

**У студзені—лістападзе гэтага года пры садзейнічанні службы занятасці на новае месца жыхарства і работы перасялілася 331 сям'я беспрацоўных. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Сёлета сярод рэгіёнаў краіны больш за ўсё сем'яў беспрацоўных, якія змянілі прапіску, было ў Віцебскай вобласці — 96. З Мінска ў правінцыю дзеля працоўнага месца і жылля перасяліліся ў гэтым годзе 7 сем'яў беспрацоўных. Дзяржаўнай праграмай садзейнічання занятасці насельніцтва на 2012 год запланавана перасяленне 335 сем'яў беспрацоўных.

Па словах спецыялістаў, праектам Дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва Беларусі на 2013 год прадугледжваецца перасяліць 252 сям'і беспрацоўных, фінансаванне на гэтыя мэты складзе больш як Br3,2 млрд. Так, на наступны год заданне па перасяленні для Віцебскай вобласці — 80 сем'яў, для Мінскай — 75, для Гомельскай — 40, для Магілёўскай — 30, для Гродзенскай — 20, для Брэсцкай — 7 сем'яў.

Перасяленне ажыццяўляецца пераважна ў сельскую мясцовасць. Як правіла, больш за іншых зацікаўлены ў пераездзе на новае месца жыхарства і работы сем'і з непаўналетнімі дзецьмі. Трэць сем'яў мяняе прапіску ў межах адной вобласці, астатнія перяязджаюць у іншы рэгіён рэспублікі.

Калі чалавек хоча ўдзельнічаць у праграме перасялення, яму неабходна звярнуцца ў службу занятасці па месцы пастаяннага жыхарства. Тут можна атрымаць усю інфармацыю аб вакансіях і жыллі, якое прадастаўляецца. Перасяленню падлягаюць (з іх згоды) беспрацоўныя мужчыны ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў, беспрацоўныя жанчыны ва ўзросце ад 18 да 55 гадоў і іх сем'і. Беспрацоўнаму, які заключыў дамову аб перасяленні на новае месца жыхарства і працы, робіцца выплата грашовых сродкаў у памеры сяміразовай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ з 1 лістапада ўстаноўлены ў памеры Br880 тыс. 030). Пры перасяленні беспрацоўнага, у складзе сям'і якога некалькі беспрацоўных, 7 БПМ выплачваецца кожнаму з іх пры ўмове заключэння з імі дамовы і прадастаўленні гарантаванага працоўнага месца. Дадаткова робіцца выплата грашовых сродкаў беспрацоўным у памеры 2 БПМ пры перасяленні з гарадоў на новае месца жыхарства і работы ў малыя, сярэднія гарадскія паселішчы, у сельскую мясцовасць, а таксама ў гарады-спадарожнікі.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЕРКЕЛЬ ПРОСІЦЬ ГРОШЫ ДЛЯ ГРЭЦЫІ

Канцлер Германіі Ангела Меркель выступае за тое, каб Еўрагрупа як мага хутчэй разблакіравала чарговы транш знешняй фінансавай дапамогі Грэцыі, які затрымліваюць ужо некалькі месяцаў. Агульны памер траншу, які будзе абмяркоўваць Еўрагрупа, павінен скласці 43,7 мільярда еўра. Першапачаткова крэдытары затрымлівалі транш, узгадняючы параметры эканамічнай праграмы дзяржавы. Апошнія ж некалькі тыдняў самі крэдытары не маглі дамовіцца аб стратэгіі скарачэння суверэннага доўгу краіны, таму затрымлівалі пералік фінансавай дапамогі.

### ГАЛАНДЗЕЦ ЗБІРАЕ ЖЫВЁЛ НА СВОЙ КАЎЧЭГ



Навaспечаны Ной ужо падняў на борт коз, авечак, коней, сабак, трусоў і некалькі відаў птушак. Галандзец Ёхан Гюберс за два тыдні да канца свету пачаў збіраць жывёл на сваім гіганцкім каўчэгу, які ён будаваў 20 гадоў. Ёхан пачаў будаўніцтва свайго каўчэга пасля павадку ў яго родным горадзе яшчэ ў 1992 годзе. З таго часу ён перакананы, што новы патоп і Апакаліпсіс адбудзецца 21 снежня. Нядаўна ён набыў сланяня для сваёй біблейскай місіі выратавання жыцця. Праўда, толькі пакуль у яго самога няма пары на каўчэзе.

### ПІВА ЎРАТУЕ АД ПРАСТУДЫ?

Японскія спецыялісты з Медыцынскага ўніверсітэта Сапара сцвярджаюць, што адзін з інгрэдыентаў піва ратуе ад прастуды зімой. Гумулон з хмеля эфектыўна супрацьстаіць рэспіраторна-сінцытыяльнаму вірусу і валодае супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі. У Сапара падкрэсліваюць: рэспіраторна-сінцытыяльны вірус можа правакаваць пнеўманію і праблемы з дыханнем у дзяцей. Сёння вакцыны ад віруса, які дае аб сабе знаць звычайна зімой, няма. Кампанія Sapporo Breweries хоча стварыць прадукты харчавання і безалкагольныя напоі з гумулонам. Але спецыялісты агаворваюцца: празмернае спажыванне піва прывядзе да набору вагі, абязводжвання і іншых праблем. У піве гумулон змяшчаецца ў надзвычай малой канцэнтрацыі. Таму, каб адчуць эфект, давядзецца выпіць каля 30 бляшанак!



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ЗША БЕЛЫЯ ХУТКА СТАНУЦЬ МЕНШАСЦЮ



**Белыя амерыканцы перастануць складаць большасць насельніцтва ЗША да 2043 года. Такі прагноз прадставіла бюро перапісу насельніцтва Злучаных Штатаў. Белых выцесняць у першую чаргу нашчадкі лацінаамерыканскіх імігрантаў, якія прыехалі ў ЗША ў 1990-х — пачатку 2000-х гадоў, таму што ў гэтых пластах насельніцтва вельмі высокі ўзровень нараджальнасці.**

Яшчэ ў 1960 годзе белыя складалі 85 працэнтаў грамадзян ЗША, аднак гэты баланс пачаў змяняцца пасля прыняцця новых міграцыйных законаў у 1965-м, якія адкрылі дзверы ў Штаты выхадцам з Лацінскай Амерыкі і Азіі. Да 2000 года колькасць белых скарацілася да 69 працэнтаў, а цяпер складае каля 64 працэнтаў з амаль 315 млн насельніцтва. Момант, калі дзяцей нацыянальных меншасцяў у ЗША стане больш, наступіць ужо ў 2019 годзе. Гэты працэс фактычна пачаўся ў 2011 годзе, калі дзяцей, малодшых за год, народжаных ад прадстаўнікоў нацыянальных і этнічных меншасцяў, стала больш, чым дзяцей белых таго ж узросту. Што тычыцца агульнай колькасці насельніцтва, то, паводле ацэнак бюро перапісу, яно дасягне 420,3 мільёна ў 2060 годзе. Пры гэтым белыя будуць складаць 43 працэнты грамадзян, лацінаамерыканцы — 31 працэнт, афраамерыканцы — 14,7, азіяты — 8.

КОРАТКА

Пасяджэнне рабочай групы па ўступленні Беларусі ў СГА адбудзецца ў пачатку 2013 года. Раней планавалася правесці пасяджэнне рабочай групы да канца 2012 года, аднак графік давялося падкарэкціраваць. «Гэта выключна тэхнічны момант, звязаны з тым, што кіраўнік рабочай групы, які назначаецца ад імя краін СГА, прадстаўнік Турцыі, завяршыў свае паўнамоцтвы ў Жэневе», — паведаміў учора журналістам намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Гур'янаў.

Грашовыя даходы ў разліку на душу насельніцтва ў студзені—кастрычніку гэтага года дасягнулі Br2 млн 678,3 тыс. за месяц і перавысілі бюджэт пражытковага мінімуму ў 3,3 раза. У структуры грашовых даходаў аплата працы займае 64,3 працэнта, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 9,9 працэнта, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і інш.) — 21,2 працэнта, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,6 працэнта.

Дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі ў студзені—кастрычніку склала $3,5 млрд. «Калі ж гаварыць аб чаканнях знешнегандлёвага сальда ў 2012 годзе, то дадатнае сальда знешняга гандлю будзе вытрымана, прычым у большых параметрах, чым мы для сябе планавалі», — паведаміў намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Гур'янаў.

## ЯКІЯ ПАДАРУНКІ НА НОВЫ ГОД ВЫ ДАРЫЦЕ СВАІМ БЛІЗКІМ?



**Алена КАСЦЮКОВА, прэс-сакратар Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі:**

— Мая 10-гадовая дачка Эва, на мой погляд, мае здольнасці да выяўленчага мастацтва. Таму ўжо даўно яна марыць вучыцца ў мастацкай школе. Мы даведаліся, што туды прымаюць менавіта з 10 гадоў.

На Новы год сваёй дачцэ я падару сур'ёзны і дарагі эцюднік. А яшчэ я вырашыла купіць ёй на святы новыя канькі.



**Алег СНІТКО, мастак-дызайнер (Мінск):**

— Выбар навагодніх падарункаў — гэта заўсёды галаўны боль. Звычайна, калі не хапае часу прыдумаць нешта цікавае, то набываю ўжо гатовыя падарункі — напрыклад, касметычныя наборы, а дзеткам — цацкі. Аднак хочацца, вядома, зрабіць які-небудзь сапраўды арыгінальны падарунак. Зараз шукаю, дзе можна надрукаваць насценныя календары з партрэтамі маіх дзяцей у падарунак нашым бабулям. А яшчэ заўсёды прыглядаюся, каб у падарунку не было нейкага схаванага, нядобрага намёку. Зразумела, што нажоў цешчы купляць не буду.



**Алена ПАТАПОВІЧ, начальнік аддзела маркетынгу і рэкламы Цэнтра гандлю нерухомасцю «Пакадан»:**

— На гэта цудоўнае свята сваім блізкім я дару шмат падарункаў матэрыяльных і не толькі. Мужу куплю бутэльку сапраўды добрага віскі. Старэйшаму сыну падару сучасную навінку тэхнікі па лініі сотавых тэлефонаў. Дачцэ — прыгожае адзенне, бо яна ў мяне вялікая модніца. Малодшаму сыну — цацку. Сёлета гэта будзе канструктар Lego. Свайму тату падару добры ліхтарык, а маме — прыгожыя валёнкі. У маіх бацькоў дні нараджэння 1 і 2 студзеня. Таму святкуем Новы год і дні нараджэння ў адзін час.

Аднак галоўным падарункам лічу ў гэта свята цудоўны настрой, бо я сваіх блізкіх вельмі моцна люблю.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ БЕЗУМОЎНАЙ РЭАЛІЗАЦЫІ ДЭКРЭТА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У цэлым кіраўнік дзяржавы даручыў у сціслыя тэрміны завяршыць рэканструкцыю. «Канцэнтруйцеся, трэба рабіць не па чарзе, а паралельна. Па-гаспадарску трэба падысці», — запатрабаваў Прэзідэнт.

Кіраўніка дзяржавы запэўнілі, што праблем са збытам прадукцыі, у тым ліку мэблі, няма. Гэтыя тавары шырока запатрабаваны як на расійскім рынку, так і ў краінах Еўропы.

Гаворачы аб мадэрнізацыі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў у цэлым, Прэзідэнт адзначыў, што, нягледзячы на правал гэтай праграмы па тэрмінах рэалізацыі, цяпер усё ж узяліся за справу. «Тое, што адбываецца ў дрэваапрацоўцы — навядзенне жалезнага парадку і па рабочай сіле, і па спецыялістах, і па тэрыторыі, і па мадэрнізацыі — гэта датычыцца ўсіх прадпрыемстваў. Усе павінны працаваць: зіма, вясна, да лета — ідэальнае прадпрыемства», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы еўрапейская краіна. Да нас ездзяць людзі. Яны павінны бачыць суперсучасныя, еўрапейскага тыпу прадпрыемствы. Гэта датычыцца ўсіх», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы сказаў, што ў бліжэйшы час мае намер дэталёва азнаёміцца з работай Аршанскага льнокамбіната, камвольнага камбіната ў Мінску і Баранавіцкага баваўнянага аб'яднання. «Гэта той комплекс, які я пагляджу. На камвольным камбінаце я буду ў бліжэйшы час, а астатнія прадпрыемствы я таксама праеду і пагляджу максімум зімой-вясной. Там павінны быць радыкальныя зрухі», — адзначыў Прэзідэнт.

Асобна Аляксандр Лукашэнка спыніўся на пытаннях развіцця льноперапрацоўчых прадпрыемстваў. «Лён мы неяк ужо навучыліся вырошчваць, хоць пакуль яшчэ і не тая якасць. Але самае галоўнае — гэта перапрацоўка», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт адзначыў, што ў Шклове цяпер створана сучаснае прадпрыемства ў гэтай сферы, якое ён мае намер наведаць.

Што датычыцца вырошчвання сельгаскультур, Прэзідэнт адзначыў, што з пункту гледжання тэхналогій па большасці з іх пытанні вырашаны: «Разабраліся са збожжам (гэта вялікая была праблема), з мукамольнай прамысловасцю, з кукурузай, займаемся новымі рэчамі. Па часнаку, цыбулі, гароху, спаржы таксама разабраліся». «У нас засталася праблема лёну. Яе трэба абавязкова вырашыць. У гэтай пяцігодцы мы павінны гэта зрабіць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Плануецца, што Аляксандр Лукашэнка 14 снежня прадоўжыць работу ў Віцебскай вобласці, дзе ў цэнтры ўвагі таксама будуць пытанні мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі.

# «ШОСТЫ ДЗЕНЬ» ПАВІНЕН БЫЦЬ КАРЫСНЫМ І ЦІКАВЫМ

**«Прамая лінія», падчас якой вывучалася сітуацыя па арганізацыі спартыўна-масавай і фізкультурна-аздараўленчай работы з навучэнцамі ў шосты школьны дзень, прайшла ў Камітэце дзяржаўнага кантролю.**

Як паведамляе прэс-служба КДК, прыкладна ў палове зваротаў, што паступілі на «прамую лінію», былі скаргі на дзеянні органаў кіравання ці адміністрацыі ўстаноў адукацыі і просьбы растлумачыць правамоцнасць іх дзеянняў. Частка зваротаў непасрэдна тычылася правядзення мерапрыемстваў у шосты школьны дзень. Напрыклад, бацькі паведамлялі, што іх дзецям на школьных мерапрыемствах папросту нецікава. Некаторыя бацькі, гатовыя аказваць садзейнічанне ў арганізацыі сумеснай работы па арганізацыі выхаднога дня, паведамлялі, што не могуць у суботу трапіць на прыём да намесніка дырэктара школы па выхаваўчай рабоце. Былі таксама скаргі і на тое, што фізкультурна- аздараўленчыя мерапрыемствы праводзяцца ў школе толькі ў першай палове суботы, ды і ўвогуле колькасць гадзін для заняткаў фізічнай культурай у раскладзе вучэбных заняткаў недастатковая. Выказваліся таксама меркаванні, што шосты дзень у школе павінен быць вучэбным — у гэтым выпадку ў раскладзе не будзе штодня па 7-8 урокаў.

Абагульніўшы ўсю інфармацыю, прадстаўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю прыйшлі да высновы, што па-ранейшаму застаецца нявырашанай праблема міжведамаснага ўзаемадзеяння пры арганізацыі адукацыйнага працэсу. У першую чаргу гэта тычыцца супрацоўніцтва паміж школай і ўстановамі дадатковай адукацыі. У прыватнасці, летась пры праверцы работы ўстаноў дадатковай адукацыі ў іх дзейнасці было выяўлена шмат недахопаў.

На думку спецыялістаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, установы дадатковай адукацыі маглі б наладзіць больш шчыльнае ўзаемадзеянне са школамі па арганізацыі шостага школьнага дня. Прадстаўнікі Камітэта дзяржкантролю таксама адзначылі, што трэба планаваць загрузку ўстаноў адукацыі на працягу ўсяго шостага школьнага дня, бо сёння большасць спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў у школах праводзіцца, як правіла, да 14 гадзін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ДЗЯРЖКАНТРОЛЬ ВЫЯВІЎ ЗАВЫШЭННЕ КОШТУ ПАСЛУГ ПА ПРЫМУСОВАЙ ЭВАКУАЦЫІ АЎТАМАБІЛЯЎ

**Жлобінскі міжраённы камітэт дзяржаўнага кантролю выявіў шэраг парушэнняў у ходзе праверкі камерцыйных структур па пытаннях выканання заканадаўства пры ажыццяўленні прымусовай эвакуацыі і захоўвання транспартных сродкаў на штрафной стаянцы. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці.**

Згодна з рашэннем Жлобінскага райвыканкама права ажыццяўляць прымусовае транспартаванне транспартных сродкаў, якія ствараюць перашкоды для дарожнага руху або пагрозу бяспецы грамадзян, было ўскладзена на індывідуальнага прадпрымальніка. Аўтамабілі дастаўляліся на ахоўную штрафную стаянку ТАА «ТрэйдАўтаСэрвіс».

Названы прадпрымальнік устанавіў мінімальны кошт прымусовай эвакуацыі легкавога аўтамабіля ў межах горада ў памеры Br250 тыс. Акрамя таго, кошт эвакуацыі ў выхадныя і святочныя дні, а таксама ў начны час павялічваецца да 100%. Пры гэтым, згодна з прэйскурантам на паслугі, якія аказвае арганізацыям Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя МУС, зацверджаным пастановай Міністэрства эканомікі ад 24 жніўня 2009 г. № 143, кошт прымусовай адбуксіроўкі транспартнага сродку на стаянку, якая ахоўваецца, складае: з поўнай пагрузкай на эвакуатар — Br40 тыс., з частковай пагрузкай на эвакуатар — Br38 тыс.

Кошт захоўвання легкавога аўтамабіля на штрафной стаянцы ТАА «ТрэйдАўтаСэрвіс» за адну гадзіну складае Br12 тыс., больш за тры гадзіны — Br50 тыс. руб., за другія і наступныя суткі — Br20 тыс. У той жа час кошт захоўвання легкавых транспартных сродкаў на звычайнай стаянцы «ТрэйдАўтаСэрвіс» складае Br7 тыс. у суткі.

Жлобінскім міжраённым камітэтам дзяржаўнага кантролю за дапушчаныя парушэнні да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута ТАА «ТрэйдАўтаСэрвіс» на суму Br5 млн, а таксама тры фізічныя асобы — на суму Br2,1 млн.

## ■ Здарэнні

# ТРАГЕДЫЯ НА БОРЦЕ

**Самалёт Масква — Хабараўск зрабіў экстранную пасадку з-за смерці пяцігадовага дзіцяці**

На борце самалёта Боінг-777, які выконваў рэйс па маршруце Масква — Хабараўск, раніцай 13 снежня памерла пяцігадовае дзіця, паведамляе **БЕЛТА** са спасылкай на Заходне-Сібірскае следчае ўпраўленне на транспарце Следчага камітэта Расіі.

Паводле папярэдніх звестак, у ходзе палёту дзіцяці стала дрэнна. Стан яго здароўя пагоршыўся настолькі, што камандзір паветранага судна прыняў рашэнне правесці пасадку ў бліжэйшым аэрапорце — у Краснаярску. Аднак, нягледзячы на прынятыя меры, урачы, што прыбылі да самалёта, канстатавалі смерць хлопчыка ■

## ■ Тры пытанні з нагоды

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ:

# «НЕ БУДЗЕ АБ'ЁМАЎ І ЛІКВІДНАЙ ПРАДУКЦЫІ — НЕ БУДЗЕ МАГЧЫМАСЦІ ГОДНА ЖЫЦЬ»

**НАГОДА для пытанняў — заданне па неабходнасці павелічэння сярэдняга ўзроўню аплаты працы, пастаўленае кіраўніком дзяржавы.**



**— Аляксандр Мікалаевіч, на Віцебшчыне рост прадукцыйнасці працы перавышае тэмпы росту зарплаты ці не?**

— Віцебская вобласць — адзіная ў краіне, дзе на момант нашай гутаркі прыблізна на 7-8 працэнтаў прадукцыйнасць працы апярэджвае заработную плату. Але я заўсёды стаўлю задачу па максімуме. І патрабую, каб першы з гэтых паказчыкаў — прадукцыйнасць працы — апярэджваў рост узроўню зарплаты на 10-15 працэнтаў.

Віцебская вобласць — лідар у Беларусі па тэмпах росту валавога рэгіянальнага прадукту. Вынік быў бы і вышэйшым, калі б мінулай восенню з поўнай загрузкай спрацавала ААТ «Нафтан». Але прадпрыемства два месяцы знаходзілася на рамонце. Адпаведныя работы ўжо завершаны. Унутраны валавы прадукт будзе павялічаны да канца года. Ёсць для яго павялічэння адпаведныя рэзервы ў аграпрамысловым комплексе, будаўніцтве, гандлі, сферы паслуг, што дазволіць вобласці да канца бягучага года давесці тэмп росту да 112-113 працэнтаў. За студзень—кастрычнік заданне ўрада перавыканана: тэмп росту склаў больш за 110 працэнтаў.

**— У сувязі з уступленнем Расійскай Федэрацыі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, напэўна, вытворцам даводзіцца шукаць новыя падыходы ў рабоце?**

— Паколькі брацкая Расія ўступіла ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, а мы з гэтай краінай знаходзімся ў адзінай эканамічнай прасторы, на Віцебшчыне праводзіцца рэвізія літаральна ўсёй наменклатуры спажывецкіх тавараў: і харчовай, і нехарчовай прадукцыі — ад іголкі да машыны. Робіцца гэта толькі для таго, каб адказаць на адно пытанне: а ці канкурэнтнай будзе гэта прадукцыя ў выніку яе экспарту на вялікі расійскі рынак? І трэба ўлічваць, што і адтуль да нас могуць прывезці на рэалізацыю аналагічную прадукцыю па больш нізкіх цэнах. Бо на больш чым 700 найменняў тавараў пасля ўступлення Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю адмяняюцца павышаныя мытныя пошліны.

І ўжо з нашага боку — мясцовай улады — падтрымка сваіх вытворцаў будзе заключацца ў тым, каб яны зрабілі канкурэнтаздольны прадукт, які б не ляжаў на складах. Каб у выніку не было вялікага таварнага запасу.

**— Дарэчы, наколькі загружаны склады прадпрыемстваў Віцебшчыны гатовай прадукцыяй?**

— Складскія запасы ў нас самыя мінімальныя ў краіне — 27-31 працэнт. У Віцебскай вобласці праводзіцца мэтанакіраваная праца па іх зніжэнні. Не будзе і ліквіднай прадукцыі — не будзе той дабаўленай вартасці, якая дала б магчымасць фарміраваць бюджэт, годна жыць і развіваць эканоміку, вырашаць сацыяльныя задачы.

І вельмі важна, каб на вытворчасці і не толькі была жорсткая дысцыпліна. А ў нас, бывае, з дысцыплінай не ўсё добра, бо некаторыя вельмі свабодна разумеюць сэнс гэтага паняцця. Забываючы, што дысцыпліна — маці перамогі. Будзе дысцыпліна, будзе якаснае выкананне пастаўленай задачы — будзе якаснае жыццё. Як і працаздольнасць, жаданне атрымаць вынік. Многія хочуць добра жыць і пры гэтым мала працаваць, а так нельга. Трэба шмат працаваць, каб добра жыць. І пры гэтым беражліва да ўсяго ставіцца.

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ** ■

## ■ Блізкая ўлада

# РОЛЯ МОЛАДЗІ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ МІНШЧЫНЫ СТАНОВІЦЦА ВЫЗНАЧАЛЬНАЙ

**ДА 2015 года неабходна рэканструяваць амаль усе прыдатныя для ўкаранення сучасных тэхналогій дзейсныя жывёлагадоўчыя памяшканні і комплексы Мінскай вобласці. За гэты ж перыяд у кожным раёне плануецца пабудаваць буйныя агракамбінаты. Яны аб'яднаюць сельскагаспадарчыя арганізацыі і перапрацоўчыя прадпрыемствы. Іх прадукцыя стане рэалізоўвацца з адпаведным брэндам. Поспеху ў рашэнні гэтых важных задач павінны садзейнічаць у тым ліку і дыпламаваныя выпускнікі навучальных устаноў. Такія перспектывы сельскай гаспадаркі Мінскай вобласці былі агучаны на сустрэчы старшыні аблвыканкама Барыса БАТУРЫ з маладымі спецыялістамі, якія працуюць у рэгіёне па размеркаванні.**

— Сёння Мінская вобласць актыўна рухаецца наперад у справе павышэння канкурэнтаздольнай прадукцыі, аптымізуецца і сама структура вытворчасці. Гэта, безумоўна, станоўча паўплывае і на годную аплату працы, у тым ліку і маладых спецыялістаў. Іх веды, уменні і здольнасці вельмі запатрабаваны. Таму кіраўнікі арганізацый павінны знаходзіць сродкі для стымулявання сумленнай працы адказных маладых кадраў — прадастаўляць дадатковыя льготы і павышаць заработную плату, — падкрэсліў Барыс Батура.

За апошнія два гады замацаванасць маладых спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у арганізацыях Мінскай вобласці дасягнула 80 працэнтаў. Гэтаму спрыялі ўдзел працадаўцаў у працы камісій па размеркаванні, дадатковыя выплаты, рашэнне жыллёвага пытання, а таксама далучэнне ўчарашніх студэнтаў да актыўнага грамадскага жыцця. Такім чынам рэалізуюцца сёння мерапрыемствы Мінскай абласной праграмы «Кадры 2011-2015 гг».

Барыс Батура зазначыў, што да маладых спецыялістаў, якія будуць працаваць у сельскай гаспадарцы, трэба адказна ставіцца яшчэ падчас іх вучобы. І добрыя прыклады гэтаму ёсць.

— Мінскі аблвыканкам і Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт распрацавалі для студэнтаў адмысловы план вучэбнай і пераддыпломнай практык. За яе час будучыя спецыялісты атрымліваюць не толькі практычны вопыт па выбранай спецыяльнасці, але і вучацца кіраўніцкай дзейнасці. Студэнты, якія паспяхова прайшлі практыку і атрымалі адпаведныя рэкамендацыі, уключаюцца ў перспектыўны кадравы рэзерв. Ён створаны з мэтай падрыхтоўкі маладых спецыялістаў для замяшчэння пасад кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Учарашні выпускнік Ігар Ясюк працуе па размеркаванні на агракамбінаце «Сноў». Ён лічыць, што накіравання на працу ў вёску баяцца не варта:

— Я скончыў летась Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію і трапіў па размеркаванні ў Нясвіжскі раён. Хачу зазначыць, што размеркаванне ў сельскую мясцовасць — гэта на самой справе не так страшна, як яно часам уяўляецца. Так, вядома, былі спачатку і свае складанасці, кшталту акліматызацыі на працоўным месцы. Але, лічу, галоўнае — зацікаўленасць у выніках сваёй працы. Працы не толькі для сябе, але і для краіны. Бо сельская гаспадарка сёння — гэта вельмі адказная галіна эканомікі з перадавымі тэхналогіямі, якая забяспечвае харчовую бяспеку краіны.




Фота БЕЛТА.

Кіраўнік Міншчыны таксама звярнуў увагу на тое, што ў вобласці шмат робіцца для паляпшэння бытавых умоў, ствараецца добрая база для заняткаў фізкультурай і спортам. У кожным раёне павінен быць плавальны басейн. Ужо ў першай палове наступнага года такія басейны адкрыюцца ў Чэрвені, Валожыне, Беразіно і Стоўбцах.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■


**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменения в проектные декларации о строительстве нежилых помещений объекта:**

УНП 100071325

«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-5 (2-я очередь). Жилой дом № 16 по генплану со встроенными помещениями» в г. Минске. Группа офисов № 1. Административно-торговое помещение № 2. Группа офисов № 3. Ожидаемый ввод в эксплуатацию нежилых помещений – 10 декабря 2012 года;

«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-5 (1-я очередь). Жилой дом № 1 по генплану» в г. Минске. Офисное помещение № 1. Офисное помещение № 2. Ожидаемый ввод в эксплуатацию нежилых помещений – 10 декабря 2012 года;

«Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-4. Жилой дом № 2 по генплану со встроенными помещениями» в г. Минске. Кафе. Ожидаемый ввод в эксплуатацию нежилых помещений – 14 марта 2013 года.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

Квалификационный аттестат на право осуществления деятельности на рынке ценных бумаг № 5200-1-13 180 от 19.02.2010 на имя Дубовец О.В. **считать недействительным.**


## ■ Факт

# У ДЗЯРЖЫНСКІМ РАЁНЕ З'ЯВІЦЦА ГАРНАЛЫЖНЫ КУРОРТ

**Тут будзе прапанаваны ўвесь комплекс адпаведных паслуг**

Пра гэта паведаміла начальнік аддзела арганізацыйнай работы аздараўлення насельніцтва і турызму ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага аблвыканкама Інга Малашкевіч.

Паводле яе слоў, гарналыжны цэнтр будуе прыватнае таварыства «Сэрвісны цэнтр «Веста». У бліжэйшы час плануецца заліць каток і адкрыць пункт пракату. Што тычыцца гары для спуску на лыжах, яна ўжо насыпана, аднак да прыёму наведвальнікаў пакуль не гатова. «Хутчэй за ўсё, у гэтым сезоне яны не паспеюць яе адкрыць: яшчэ трэба выканаць вялікі аб'ём работ», — адзначыла І. Малашкевіч. Схіл для катання будзе падрыхтаваны да наступнага сезона.

**Павел ДЗЯРГАЧ** ■

## ■ Як жывяце, землякі?

У РЭГІЁНЕ

Брэстчына

# РАБОТА НА ЗЯМЛІ — НЕ ПЕРАШКОДА ДЛЯ ВЫСОКАГА ПАЛЁТУ

**Уласны міні-авіяпарк стварыў жыхар вобласці**

У калекцыі Анатоля Мартысюка — самалёты сельскагаспадарчага прызначэння і асабістага карыстання. Лётчык-аматар кіруе прадпрыемствам па гадоўлі і перапрацоўцы сельгаспрадукцыі, але гэта не перашкодзіла яму рэалізаваць мару дзяцінства — сесці за штурвал уласнага самалёта.

Анатоль Мартысюк «хварэў» на самалёты з дзяцінства. Марыў пра авіяцыйную кар'еру. Нават паступаў у Чарнігаўскае вучылішча ваенных лётчыкаў, праўда, па стане здароўя вучыцца там не давялося. Але мара аб высокім палёце рэалізавалася. Свой першы самалёт, «Цесну-150», Анатоль набыў у Германіі. А сёння ў лётчыка-аматара авіямашына з іншай гісторыяй.

«Кардынал» — так называе сваю дарагую «цацку» Анатоль Мартысюк. На гэтым самалёце ў свой час лятаў святар у Каліфорніі, а цяпер — кожны тыдзень за штурвалам беларускі прадпрымальнік. Але Анатоль не спыняецца на адной крылатай машыне. Яшчэ адна мара — эксклюзіўны самалёт, па ўласных чарцяжах, — ужо будуецца. У планах — рамонт некалькіх «АН-2». Такія машыны дапамагаюць у апрацоўцы палёў і абароне раслін з паветра. Аднаўляць авіятэхніку дапамагаюць вопытныя спецыялісты.

Каб зацікавіць мясцовую моладзь, Анатоль Мартысюк плануе адкрыць аэраклуб.

**Сяргей ДАБРАВОЛЬСКІ.**

Віцебшчына

# БУДЗЕМ ЖАНІЦЦА!

**Жаніхі і нявесты ў Віцебску не вераць прадказанням мая**

Віцебскія жаніхі і нявесты не вераць у прадказанні мая пра канец свету 21 снежня 2012 года. У іх на гэты дзень зусім іншыя планы...

Як вядома, здагадка пра канец свету ў гэты дзень звязана з заканчэннем чарговага цыкла працягласцю ў 5125 гадоў па календары індзейскага племя мая. Аднак моладзь Віцебска матрыманіяльныя планы хвалююць больш, чым таямніцы старажытных трактатаў, а таму гэты дзень у іх звязаны выключна з рамантычным настроем з нагоды дня шлюбу. Нягледзячы на халодны снежань і калядны пост, у ЗАГСе Віцебскага гарвыканкама ў гэты дзень урачыста ўзаконяць свае адносіны 11 пар, а ў ЗАГСе Першамайскага раёна Віцебска — 9. «Даведаўшыся пра запланаваны на 21 снежня «канец свету», некаторыя маладыя людзі прасілі перанесці шлюб на іншую дату, а некаторыя, наадварот, вырашылі правесці цырымонію ў гэты дзень, каб зрабіць яе яшчэ больш памятнай», — расказалі ў ЗАГСах абласнога цэнтра.

Магчымасць паспець сумясціць гэтыя дзве падзеі ў жаніхоў і нявест Віцебска пакуль ёсць, бо, згодна з заканадаўствам, зарэгістраваць шлюб цяпер можна ў трохдзённы тэрмін. Апошні дзень падачы заяў на 21 снежня — 18-га.

Не засталася без увагі яшчэ адна прыгожая дата цяперашняга снежня — 12.12.12. Хоць гэта быў і будны дзень, заручальнымі пярсцёнкамі ў мінулую сераду абмяняліся 20 пар. Некаторыя спецыяльна выбралі гэтую дату, каб яна засталася ў дакументах, а адзначаць свята, як і прынята, у выхадныя.

**Антон ЗАПОЛЬСКІ.**

Гомельшчына

# І ПРАЦУЮЦЬ, І АДПАЧЫВАЮЦЬ РАЗАМ

**Лепшую маладую сям'ю ў Гомельскай вобласці выберуць сёння**

Фінал конкурсу «Лепшая маладая сям'я Гомельшчыны - 2012» пройдзе ў абласным цэнтры, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ў аддзеле па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама.

Права насіць такі тытул будуць адстойваць 6 сем'яў з Савецкага раёна Гомеля, Хойніцкага, Рагачоўскага, Гомельскага, Мазырскага і Светлагорскага раёнаў. У ліку ўдзельнікаў, якія здолелі пераадолець адборачныя раённыя і міжрэгіянальныя туры, тры пары з'яўляюцца шматдзетнымі і тры выхоўваюць па двое дзяцей.

Па словах арганізатараў, кожная сям'я-фіналістка цікавая па-свойму. А аб'ядноўвае прэтэндэнтаў на перамогу насычанае сямейнае жыццё, у якім ёсць месца і працы, і выхаванню дзяцей, і разнастайнаму адпачынку. Падчас фіналу ўдзельнікам трэба будзе прадставіць сваю сям'ю, прадэманстраваць творчы патэнцыял, прайсці выпрабаванне гульнявым і інтэлектуальным конкурсамі.

Уладальнік тытула «Лепшая сям'я Гомельшчыны-2012» будзе ўдастоены дыплома і грашовага сертыфіката на Br3 млн. Прызёрам конкурсу, якія занялі другое і трэцяе месцы, будуць уручаны грашовыя сертыфікаты на Br2 млн і 1 млн адпаведна. Акрамя таго, удзельнікаў чакаюць каштоўныя падарункі ад партнёраў-спонсараў: сертыфікаты на дзіцячы абутак, экскурсійная паездка ў Санкт-Пецярбург і іншыя.

Конкурс «Лепшая маладая сям'я Гомельшчыны» праводзіцца ў рэгіёне з 2008 года.

Гродзеншчына

# ПРАЯЗНЫЯ ПРАЦОЎНАГА ДНЯ ЎВОДЗЯЦЦА Ў ГРОДНЕ З НОВАГА ГОДА

Яны будуць двух відаў — на месяц і на паўмесяца (з 1-га дня месяца па 15-е і з 16-га па 31-е). Гэтыя праязныя дакументы сапраўдныя толькі ў працоўныя дні. Пачаць продаж гэтых дакументаў плануецца з другой дэкады снежня. Яны будуць танней за звычайныя праязныя.

**Ул. інф.**

Магілёўшчына

# ВЯСЁЛАЯ ЗМЕЙКА — НА ШЧАСЦЕ Ў НОВЫМ ГОДЗЕ

**Святочныя сувеніры вырабляюць навучэнцы Магілёўскага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа**



У гэтай навучальнай установе вучыцца каля трохсот студэнтаў з асаблівасцямі развіцця. Разам з педагогамі яны вырабілі больш за 700 навагодніх сувеніраў.

— Сімвалы 2013 года — забаўныя змейкі, нікога не пакінуць абыякавымі, — кажа дырэктар каледжа Алег Бахановіч. — У іх укладзены праца і сэрца дзяцей. Такія цацкі абавязкова прынясуць шчасце ў будучым годзе.

Цяпер змейкі можна набыць у краме каледжа: яны каштуюць 29 тысяч рублёў. Тут прапануюць вялікі асартымент навагодніх сувеніраў: цацкі-анёлы, сурвэткі, саламяныя вырабы і іншыя. Увогуле каледж, дзе атрымліваюць прафесію маладыя людзі з абмежаванымі магчымасцямі, спецыялізуецца на вырабе сувенірнай прадукцыі да розных свят. Гэта і заробак, і добры імідж навучальнай установы.

**Ілона ІВАНОВА.**

Міншчына

# ДЛЯ НАВАГОДНЯГА СТАЛА

**Рыбныя кірмашы пройдуць у Мінскай вобласці з 8 па 30 снежня**

Сезон рыбных кірмашоў стартуе ў Барысаве, дзе гандаль будзе арганізаваны 8-9 снежня на плошчы каля гарадскога Дома культуры.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Рыба ў шырокім асартыменце будзе прадстаўлена ў Мар'інай Горцы (на рынку Пухавіцкага райспажыўсаюза) 15 снежня, у Валожыне (на пл. Свабоды) — 16 і 23 снежня, у Маладзечне (на пл. Старое месца) — 22 снежня. У Слуцку (па вул. Леніна) і ў Салігорску (на цэнтральнай плошчы) рыбныя кірмашы адбудуцца 23 снежня, у Крупках (на цэнтральнай плошчы) — 24 і 30 снежня, у Вілейцы (на пл. Леніна) — 23 і 24 снежня, у Жодзіне (на аўтастаянцы па вул. 50 гадоў Кастрычніка) — 24 і 30 снежня.

У кожным з кірмашоў прымуць удзел не менш за пяць рыбаводчых гаспадарак і рыбаперапрацоўчых прадпрыемстваў з усёй рэспублікі. Пакупнікам будзе прапанаваны шырокі асартымент прадукцыі па цэнах вытворцаў: жывая сажалкавая рыба (карп, таўсталобік, белы амур, карась і іншая), каштоўныя пароды рыб (асетр, фарэль). На рыбных таргах можна будзе набыць таксама маражаную, вэнджана-вяленую рыбу, рыбныя паўфабрыкаты.

**Яўген КАРАНЕЎСКІ.**

# ПЯТНІЦА, 21 СНЕЖНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10** Зона Х.
**9.10 Серыял «Джамайка».**
**10.10** Сфера інтарэсаў.
**10.25** Патрабуецца.
**10.45, 21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**10.55 Серыял «Мужчына ўва мне».**
**12.15, 1.10** Летапіс часоў.
**13.05** «Зямля беларуская». «Кліч Евы»
**13.20** М/ф «Умка».
**13.30** Заўтра — гэта мы!
**14.00 Серыял «Зорныя вароты. Першы атрад».**
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Прывітанне, мама!».**
**16.15** Каталіцкія святыні Беларусі.
**16.45** «Здароўе». Ток-шоу.
**17.25 Серыял «Маруся. Выпрабаванні».**
**18.25, 0.15** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.40** Калыханка.
**19.55** «Зорнае жыццё». «Зорныя пахудзенні».
**21.00** Панарама.
**21.55** «Містычныя гісторыі».
**23.05 Серыял «Майстры жахаў».**
**1.00** Дзень спорту.
**17.10** Беларуская кухня.
**18.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Экстраліга. «Металург» — «Юніёр».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Экстрасэнсы вядуць расследаванне.
**22.40** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**23.30** Фактар сілы.
**0.00** Арэна.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Дараваць».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Танна і добра».
**12.05 Серыял «Няроўны шлюб».**
**13.10** «Час абедаць!».
**13.50** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**16.15** «Кантрольная закупка».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Нябачны».**
**22.55** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Фінал.
**0.35** «Вячэрні Ургант».
**1.35** «Пасля школы».
**2.35** Начныя навіны.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.50 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**10.10** Час футбола. Вынікі года.
**11.00** Страсці па культуры.
**11.40 Драма «Кадэт».**
**13.35 Фільм-катастрофа «Экіпаж». 2-я серыя.**
**14.50, 0.30 Камедыя «Тры жанчыны і мужчына».**
**16.40** Наперад у мінулае.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Каханне 911».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40** «Пад абаронай».
**11.10, 17.30** «Званая вячэра».
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.50 Трылер «Мсціўца».**
**15.45** «Прыгожа жыць».
**16.50 «Следакі». Серыял.**
**18.30** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Камедыя «Дачка майго боса».**
**23.00** «Якія людзі!».
**23.55** «Расійская покерная серыя».
**0.45** «Спецыяльны праект»: «Мне не страшна».

## МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**5.05, 6.05 Серыял «Вылечванне каханнем».**
**7.05** «Цік-так».
**7.25** М/с «Прыгоды майстра Кун-фу».
**8.05, 9.05 Серыял «Сёстры па крыві».**
**10.05 Серыял «Усё ўключана».**
**11.05** «Рэспубліка сёння».
**11.25** «Свет навукі».
**12.20 Серыял «Трое зверху».**
**13.20, 2.20 Маст. фільм «Візіт да Мінатаўра».**
**15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**17.05** «Злачынствы і пакаранне».
**17.35** «Простая мова».
**18.25** «Акцэнты».
**18.40 Маст. фільм «Дазвольце цябе пацалаваць».**
**21.25** «Любімыя акцёры. М. Карачанцаў».
**22.00 Маст. фільм «Сабака на сене».**
**0.30** «Добрыя жарты».
**3.50** Дак. серыял «У свеце цудаў».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 12.25, 18.45, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**7.05, 15.00 Серыял «Клан Сапрана».**
**8.00** М/ф «Сакрэтная служба Санта-Клауса».
**8.30, 14.30 Серыял «Незямны сёрфінг».**
**8.55, 17.40 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**10.00** «Мой любімы гадаванец».
**10.30 Серыял «Цудоўны».**
**12.30 Трылер «Імгла».**
**16.00** «Мультпарад».
**16.20** «Адшукваецца адпачынак».
**16.50 Серыял «Пляткарка».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Шукаю сябра на канец свету».**
**22.55 Серыял «Людзі Альфа».**

## ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 19.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.30, 18.30** «Гісторыі ў дэталях».
**9.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00, 21.10** Скетч-шоу «6 кадраў».
**10.35, 21.45** Скетч-шоу «Анекдоты».
**11.00, 15.00** «Зорныя гісторыі».
**12.00, 17.00** «Жаночая форма».
**13.00, 22.20** «Не можа быць».
**14.00** «Гарадское падарожжа».
**16.00** «Скажы, што не так?!»
**18.00, 19.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Па-за законам».
**0.00** «Што адбываецца?».
**0.30 Дэтэктыў «Шлюбнае чытво».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.10** «Прамы эфір».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Мая планета».
**11.50 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела».**
**13.50, 16.50, 19.50, 0.20** Навіны—Беларусь.
**14.30** «Пакой смеху».
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.55 Серыял «Справа следчага Нікіціна».**
